Кісялёў, Дз.М. Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце ў 90-я гг. XX ст. / Дз.М. Кісялёў // Працы гістарычнага факультэта : навук. зб. Вып. 1 / рэдкал. : У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2006. — С19–28.

*ДЗ. М. КІСЯЛЁЎ*

# ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА Ў БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ Ў 90-я гг. XX ст.

Гістарычны факультэт БДУ, флагман беларускай гістарычнай навукі, з’яўляецца адзінай установай у рэспубліцы, дзе працэс навучання спалучаўся з актыўнымі даследаваннямі па ўсіх асноўных напрамках гістарычнай навукі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, якія праводзілі не толькі выкладчыкі, але і студэнты. Супрацоўнікі факультэта прымалі актыўны ўдзел у працэсе станаўлення нацыянальнай гістарычнай навукі з улікам новых метадалагічных падыходаў, у распрацоўцы нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі і прынцыпаў яе выкладання ў школе і вну.



У 1991 г. у структуру факультэта ўваходзіла 6 кафедр: гісторыі Беларусі, гісторыі СССР дасавецкага перыяду, гісторыі СССР эпохі сацыялізму, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, новай і навейшай гісторыі, кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін — і навукова-даследчая лабараторыя гісторыі Беларусі. У жніўні 1991 г. кафедра гісторыі СССР дасавецкага перыяду была перайменавана ў кафедру расійскай гісторыі, а ў студзені 1992 г. — расійскай і славянскай гісторыі са старажытнасці да пачатку XX ст., а кафедра гісторыі СССР эпохі сацыялізму — у кафедру навейшай гісторыі славянскіх краін. У 1998 г. яны канчаткова трансфармаваліся ў кафедры гісторыі Расіі і гісторыі паўднёвых і заходніх славян. З 1992 г. існавала кафедра міжнародных адносін, на базе якой у 1995 г. створаны самастойны факультэт. У 1992 г. пачынаецца гісторыя кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства. У 1994 г. у сувязі з пашырэннем і паглыбленнем вывучэння курса айчыннай гісторыі кафедра гісторыі Беларусі была падзелена на дзве: кафедру гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў і кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Апошнія структурныя змены адбыліся ў 2000 г., калі ў выніку інстытуалізацыі асобных гістарычных дысцыплін і ў мэтах удасканалення навучальнага працэсу на аснове кафедр крыніцазнаўства і музеязнаўства і археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін утварылася кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў — колькасць кафедр дасягнула дзевяці.

Змены адбыліся і ў выкладчыцкім складзе факультэта. Калі ў 1991 г. працавалі 58 выкладчыкаў, сярод якіх 9 дактароў навук і 42 кандыдаты, то ў 2000 г. іх стала амаль 100, з іх 17 дактароў і 64 кандыдаты гістарычных навук. Колькасць дактароў узрасла на 2 %, а колькасць кандыдатаў знізілася прыкладна на 7 %, што сведчыла аб старэнні навукова-педагагічных кадраў факультэта.

Асноўныя лічбавыя паказчыкі развіцця навукі на гістарычным факультэце ў 90-я гг. дадзены ў табліцы.

На пачатку 90-х гг. колькасць планавых тэм навукова-даследчай работы павялічылася ўдвая, потым заставалася стабільнай і ў апошнія гады зноў павялічылася на трэць. Пры гэтым паступова ўзрастала колькасць тэм, якія распрацоўваліся па дадатковым фінансаванні. Вынікі даследаванняў былі адлюстраваны ў адпаведных манаграфіях, падручніках і дапаможніках. Калі ў 1991—1993 гг. фармуляваліся вузкапрофільныя кафедральныя тэмы, у большасці дапрацоўваліся старыя, то з сярэдзіны 90-х гг. пачынаюць пераважваць распрацоўкі ў міждысцыплінарнай вобласці, з выкарыстаннем навейшых дасягненняў сусветнай гістарычнай навукі, каштоўнаснага і цывілізацыйнага падыходаў, дзе гісторыя Беларусі і ўвогуле ўсходніх славян разглядаецца непадзельна ад агульначалавечага цывілізацыйнага працэсу.

## НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА (ПА СПРАВАЗДАЧАХ АБ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОЦЕ) [1]

| Гады | Колькасць тэм НДР | У тым ліку з дадатковым бюджэтным фінансаваннем | Колькасць навуковых публікацый | Агульны аб'ём (друк. арк.) | Манаграфіі і кнігі | Вучэбныя дапаможнікі і падручнікі | Канферэнцыі, арганізаваныя факультэтам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1991 | 8 | 3 | 91 | 115 | 5 | 2 | 1 |
| 1992 | 12 | 6 | 78 | 80 | 4 | — | 2 |
| 1993 | 16 | 8 | 160 | 201 | 5 | 14 | 2 |
| 1994 | 17 | 7 | 438 | 198 | 12 | 7 | 1 |
| 1995 | 15 | 8 | 81 | 215 | 3 | 3 | 2 |
| 1996 | 16 | 10 | 131 | 204 | 12 | 4 | 2 |
| 1997 | 17 | 13 | 136 | 293 | 8 | 15 | 1 |
| 1998 | 13 | 10 | 180 | 466 | 7 | 25 | 4 |
| 1999 | 23 | 15 | 210 | 228 | 10 | 7 | 5 |
| 2000 | 24 | 18 | 325 | 456 | 8 | 6 | 3 |

У 1994 г. быў дасягнуты рэкорд — 438 навуковых публікацый, у асноўным за кошт таго, што выкладчыкі факультэта прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы матэрыялаў нацыянальных энцыклапедычных выданняў. У наступным годзе назіраецца скарачэнне колькасці публікацый у 5 разоў, але з 1996 г. усталявалася тэндэнцыя паступовага павелічэння і колькасці, і агульнага аб'ёму навуковых прац выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў факультэта. Асноўную масу публікацый складалі артыкулы ў друку і тэзісы ў зборніках матэрыялаў канферэнцый, колькасць манаграфій заставалася невысокай, хаця і ўзрасла ў другой палове 90-х гг. амаль удвая. Галоўнымі прычынамі гэтага былі як фінансавая абмежаванасць факультэта, так і адсутнасць значнай колькасці навукова якасных падрыхтаваных прац.

На гістарычным факультэце ў 90-я гг. быў арганізаваны шэраг навуковых канферэнцый рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню па актуальных праблемах гістарычнай навукі. І калі напачатку адбываліся 1—2 канферэнцыі ў год, то ў 1998—2000 гг. — па 3—5. Канферэнцыі садзейнічалі скасаванню



лакальнасці беларускай гістарычнай навукі і замкнутасці асобных гістарычных устаноў, усталяванню навуковых сувязей з гісторыкамі замежжа, праз іх ішоў працэс абмену вопытам, думкамі, новымі ідэямі і падыходамі. Сярод найбольш значных неабходна назваць «Метадалагічныя праблемы гістарычнай навукі» (1992), I і II Усебеларускія канферэнцыі гісторыкаў у 1993 г. і ў 1997 г. адпаведна, «Архівазнаўства, крыніцазнаўства, гістарыяграфія Беларусі: стан і перспектывы» (1993), «Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэнне і выкладанне» (1998), «Праблемы беларускай археаграфіі» (1999), канферэнцыі з нагоды юбілеяў У. М. Ігнатоўскага, М. В. Доўнар-Запольскага, М. М. Нікольскага, В. М. Перцава і М. М. Улашчыка. Выкладчыкі, аспіранты і студэнты пастаянна ўдзельнічалі ў тэматычных канферэнцыях, семінарах і круглых сталах, якія адбываліся як у рэспубліцы, так і за яе межамі. Штогод праводзілася студэнцкая навуковая канферэнцыя.

Выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта прымалі актыўны ўдзел у распрацоўцы падручнікаў і дапаможнікаў па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў усіх трох «хваляў»: 1989—1991 гг. (нацыянал-камуністычная версія гісторыі Беларусі), 1992—1995 гг. (нацыянальная канцэпцыя гісторыі) і 1996—1998 гг. (у большасці рэсаветызаваныя падручнікі), метадычнай літаратуры ў дапамогу настаўнікам і выкладчыкам. Вялікі ўклад унеслі ў стварэнне першых нацыянальных энцыклапедычных выданняў, такіх як «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Беларуская энцыклапедыя», «Беларусь», «Археалогія і нумізматыка Беларусі», «Мысліцелі і асветнікі Беларусі», «Знешняя палітыка Беларусі» і інш.

Гістарычны факультэт БДУ забяспечваў правядзенне навуковых даследаванняў па ўсіх накірунках гістарычнай навукі, з выкарыстаннем як традыцыйных сюжэтаў, метадаў і падыходаў, так і навейшых дасягненняў сусветнай метадалогіі і гістарыяграфіі.

Даследаванні ў галіне айчыннай гісторыі, асабліва сацыяльная і палітычная яе складаючыя, з'яўляліся прыярытэтнымі на факультэце. Кафедры гісторыі Беларусі развіваліся найбольш дынамічна, давалі асноўную частку навуковай прадукцыі, актыўна ўдзельнічалі ў канферэнцыях, семінарах і круглых сталах, арганізавалі шэраг навуковых сустрэч, напрыклад: «Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР»

(1999), «Тадэуш Касцюшка: Спадчына, час і здабыткі» (2000). Большасць магістрантаў і аспірантаў факультэта спецыялізаваліся па айчыннай гісторыі. Значная колькасць навукова-даследчых тэм іншых кафедр фармулявалася так, каб мець праекцыю на гісторыю Беларусі.

Супрацоўнікі кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў займаліся распрацоўкай праблематыкі ўтварэння Вялікага княства



Літоўскага, аграрнай гісторыі Беларусі, пытанняў эканамічнага, палітычнага, рэлігійнага і культурнага жыцця беларускага грамадства, яго саслоўнай эвалюцыі, вывучэннем гісторыі знешніх і ўнутраных ваенных канфліктаў і сацыяльных супярэчнасцей у XVI—XVIII ст.

У сферу навуковых інтарэсаў выкладчыкаў кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ўваходзілі сацыяльнае, грамадска-палітычнае, рэлігійнае і культурнае развіццё Беларусі ў XIX—XX ст., гісторыя войн і паўстанняў гэтага перыяду, становішча заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы ў 1921—1939 гг., нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі ў 1917—1920 гг., гісторыя і гістарыяграфія гістарычнай навукі Беларусі [4, с. 30—34].

Вынікі навуковых пошукаў адлюстраваны ў шматлікіх манаграфіях, артыкулах, падручніках і дапаможніках па гісторыі і беларусазнаўству. У акадэмічнай серыі «Нашы славутыя землякі» выйшлі гісторыка-біяграфічныя нарысы А. Г. Каханоўскага «Руплівец нашай старасветчыны. Яўстах Тышкевіч» (Мн., 1992) і Я. Юхо, У. Емяльянчыка «Нарадзіўся я ліцьвінам: Тадэуш Касцюшка» (Мн., 1994). Першая кніга прысвечана жыццю і творчасці этнографа, фалькларыста, краязнаўца і археолага Я. П. Тышкевіча, аднаго з заснавальнікаў Віленскага музея старажытнасцей. Другая — драматычнаму лёсу Андрэя Тадэуша Касцюшкі, нацыянальнага героя Беларусі, Польшчы і ЗША, ганаровага грамадзяніна Францыі, аднаго з арганізатараў апошняга сацыяльнага выбуху на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Сугучна з ёй манаграфія У. П. Емяльянчыка «Паланэз для касінераў: З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі» (Мн., 1994), дзе аналізуюцца мэты, ход і вынікі паўстання, удзел у ім розных слаёў беларускага насельніцтва.

Дасягненні ў даследаванні палітычнай гісторыі Беларусі першай чвэрці XX ст. адлюстраваны ў працах П. І. Брыгадзіна і У. Ф. Ладысева. У манаграфіі П. І. Брыгадзіна «Эсэры на Беларусі (канец XIX ст. — люты 1917 г.» (Мн., 1994), на аснове якой ён у 1995 г. абараніў доктарскую дысертацыю, упершыню аналізавалася гісторыя ўзнікнення партыі сацыял-рэвалюцыянераў на Беларусі, яе ўдзел у першай расійскай рэвалюцыі, думская тактыка, дзейнасць падчас першай сусветнай вайны.

У кнізе У. Ф. Ладысева, П. І. Брыгадзіна «На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917—1920 гг.)» (Мн., 1999) з дапамогай вялікай колькасці архіўных дакументаў разглядаўся складаны шлях пабудовы самастойнай беларускай дзяржавы, роля ў гэтым працэсе партый і асобных дзеячаў розных палітычных арыентацый, утрымліваліся біяграфічныя звесткі аб 40 грамадска-палітычных дзеячах Беларусі таго перыяду.



У напрамку вывучэння сацыяльнай гісторыі з'явілася манаграфія У. А. Сосны «Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX ст.» (Мн., 2000), першае комплекснае даследаванне эвалюцыі палітыкі царскіх улад па фарміраванні саслоўных груп беларускага сялянства ў першай палове XIX ст., дзе разглядаліся змены ў зямельнаўласніцкіх адносінах і сацыяльна-прававым статусе ўсіх катэгорый сялян.

Перспектывамі далейшага развіцця даследаванняў у галіне айчыннай гісторыі былі вызначаны фарміраванне дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі ў IX—XII ст., сацыяльная гісторыя Беларусі часоў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі перыяду Расійскай імперыі, палітычная гісторыя Беларусі XX ст., гендэрныя даследаванні, гісторыя знешніх войнаў і ўнутраных канфліктаў, развіццё культуры Беларусі.

На факультэце вялікая ўвага надавалася даследаванням праблем гісторыі і культуры славянскага свету, якія праводзіліся на адпаведных кафедрах. Тэматыка навуковых пошукаў выкладчыкаў кафедры гісторыі Расіі закранала гісторыю Маскоўскай дзяржавы, Расійскай імперыі і гісторыю СССР, іх сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё, унутраную і знешнюю палітыку, а таксама сучасныя падзеі на тэрыторыі Расіі і Украіны. Вяліся даследаванні з выкарыстаннем цывілізацыйнага падыходу, якія спрабавалі высвятліць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары, што абумовілі асаблівасці гістарычнага шляху народаў Усходняй Еўропы. Навуковы прадукт кафедры, за выключэннем манаграфій А. А. Яноўскага, В. І. Бобышава «Дыпламатыя і дыпламаты Расіі (ад Івана III да Пятра Вялікага» (Мн., 2000), дзе аналізавалася міжнароднае становішча Маскоўскай дзяржавы ў XV—XVII ст., вылучаліся асноўныя накірункі і задачы яе знешняй палітыкі, і В. І. Менькоўскага «Англа-амерыканская саветалогія» (Мн., 2000), яго доктарская дысертацыя, складаўся толькі з артыкулаў у друку і адпаведных раздзелаў у падручніках і дапаможніках [6, с. 14—23].

Асноўны накірунак навукова-даследчыцкай працы кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян — сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё славянскіх краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы, цэнтральнымі пытаннямі якога з'яўляліся геапалітычныя праблемы на Балканах, эканамічная гісторыя Югаславіі ў XX ст., культурнае развіццё Польшчы ў міжваенны перыяд, сучасныя палітычныя працэсы ў Балгарыі, культура паўднёвых і заходніх славян эпохі феадалізму, гістарыяграфія гісторыі славян. Аднак значная педагагічная нагрузка не дазваляла грунтоўна займацца навуковымі даследаваннямі. Кафедра пры сваёй нешматлікасці забяспечва-



ла выкладанне курсаў гісторыі і культуры паўднёвых і заходніх славян, а таксама гісторыі расійскай і ўкраінскай культуры, распрацавала курс «Гістарычнай экалогіі», за ёй замацавана выкладанне педагагічнага курса «Методыка выкладання гісторыі ў сярэдняй школе». Таму ў 90-я гг. не з'явілася ніводнай навуковай манаграфіі [3, с. 293—295].

Кафедра гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў з'яўлялася вядучым у Беларусі навуковым цэнтрам па даследаванні праблем гісторыі Старажытнага Усходу, антычнасці і медыявістыкі. Асноўнымі накірункамі даследчыцкай дзейнасці з'яўляліся: хеталогія, сацыяльная гісторыя старажытнай Індыі, міфалогія, палітычнае жыццё Афін, Пунічныя войны, антычнае і заходнееўрапейскае хрысціянства, менталітэт і культура еўрапейцаў у сярэднявеччы. Кафедра вылучалася вялікай колькасцю публікацый: В. А. Фядосік «Кіпрыян і антычнае хрысціянства» (Мн., 1991), Е. Д. Смірнова, С. А. Рогач «Грамадска-прававы і сямейна-бытавы статус заможнай жанчыны Францыі XI—XIV ст.» (Мн., 1996), К. А. Рэвяка «Антычная спадчына на Беларусі» (Мн., 1998), І. А. Еўтухоў «Познеантычная канцэпцыя чалавека» (Мн., 2000), В. І. Ханкевіч «Старажытныя цывілізацыі» (Мн., 2000) і шмат іншых.

Кафедра гісторыі новага і навейшага часу распрацоўвала праблематыку метадалогіі і тэорыі ўсеагульнай гісторыі, пытанні развіцця ісламскага свету, эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя аспекты навейшай гісторыі Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі і ЗША. Аднак навуковых прац, акрамя невялікіх артыкулаў, за 90-я гг. не з'явілася, за выключэннем адзінай манаграфіі У. С. Кошалева «Егіпет ад Арабі-пашы да Саада Заглула. 1879—1924» (М., 1992) і ўдзелу прафесара П. А. Шупляка ў падрыхтоўцы калектыўнай манаграфіі «Рудольф Гесс», выдадзенай у Лейпцыгу ў 1999 г.

Кафедра археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін з'яўлялася адзіным вучэбным падраздзяленнем у рэспубліцы, якое ажыццяўляла падрыхтоўку прафесійных кадраў археолагаў і этнографаў. Яна забяспечвала правядзенне даследаванняў і выкладанне гісторыі першабытнага грамадства, археалогіі, этнаграфіі, краязнаўства, картаграфіі, нумізматыкі, геральдыкі, сфрагістыкі, фалерыстыкі і палеаграфіі. Выкладчыкамі кафедры складзены першыя ў рэспубліцы падручнікі і дапаможнікі для студэнтаў па гэтых дысцыплінах, сярод якіх: М. Ф. Піліпенка «Узнікненне Беларусі: новая канцэпцыя» (Мн., 1991), В. Н. Рабцэвіч «Нумізматыка Беларусі» (Мн., 1995), Э. М. Загарульскі «Генеалогія полацкіх князёў Ізяславічаў» (Мн., 1994), Э. М. Загарульскі «Пачатак фарміравання насельніцтва Беларусі» (Мн., 1996), Э. М. Загарульскі «Заходняя Русь IX—XIII ст.» (Мн., 1998), А. А. Егарэйчанка «Старажытныя гарадзішчы беларускага Палесся» (Мн., 1996).



Наватарскай і адной з прыярытэтных на факультэце з'яўлялася навуковая тэматыка кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства: метадалогія гісторыі, гістарычная інфарматыка, псіхагісторыя, археаграфія, архівазнаўства, крыніцазнаўства, тэорыя і гісторыя музейнай справы. Кафедра з'яўлялася штаб-кватэрай Беларускай галіны асацыяцыі «Гісторыя і кампутар» і Беларускай псіхагістарычнай асацыяцыі. Супрацоўнікамі кафедры ўпершыню ў Беларусі падрыхтаваны і выдадзены шэраг падручнікаў, дапаможнікаў і манаграфій: «Гістарычная інфарматыка» (Мн., 1994), «Метадалогія гісторыі» (Мн., 1996), «Сучасная сусветная гістарычная навука» (Мн., 1996), «Псіхагісторыя: школы і метады» (Мн., 1997), «Архівазнаўства Беларусі» (Мн., 1998), «Крыніцазнаўства Беларусі» (Мн., 1999), «Метадалогія гістарычнага даследавання» (Мн., 2000) і інш. Цыкл прац па гісторыі беларускага мастацтва XII—XVIII ст. прафесара Н. Ф. Высоцкай быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь [5, с. 5—32].

Факультэт актыўна супрацоўнічаў з Інстытутам гісторыі НАНБ, вну рэспублікі, з гістарычнымі факультэтамі Йенскага, Варшаўскага, Беластоцкага, Кіеўскага, Маскоўскага і Вільнюскага універсітэтаў, навуковымі калектывамі Літвы, Расіі, Украіны і Польшчы. Вяліся сумесныя даследаванні, ажыццяўляўся абмен вопытам і студэнтамі.

Гістарычныя навуковыя даследаванні ажыццяўляліся ў БДУ і агульнауніверсітэцкай кафедрай сусветнай і айчыннай гісторыі (да 1991 г. кафедра гісторыі КПСС, у 1991 г. — кафедра палітычнай гісторыі). У 1991 г. на кафедры працавала 30 чалавек, сярод якіх 2 дактары і 17 кандыдатаў навук. На працягу 90-х гг. колькасць супрацоўнікаў пастаянна скарачалася, пакуль у 2000/01 навучальным годзе кафедра канчаткова не ўвайшла ў склад кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Асноўны накірунак даследаванняў — палітычная гісторыя Беларусі XX ст. Выкладчыкамі кафедры падрыхтавана больш за 20 манаграфій і

брашур, вялікая колькасць навуковых артыкулаў. Шмат увагі надавалася друкаванню праграм беларускіх палітычных партый. Квінтэсенцыяй навуковай працы кафедры стала калектыўная манаграфія «Дзяржаўнасць Беларусі. Праблемы фарміравання ў праграмах палітычных партый» (Мн., 1999), у якой разглядаліся ідэі і праграмныя палажэнні палітычных партый па пытанні дзяржаўнасці на Беларусі на працягу XX ст. і рабілася выснова аб эвалюцыйным характары працэсу станаўлення незалежнай беларускай дзяржавы «ад месцячковага нацыяналізму да суверэннай Рэспублікі Беларусь».

У 90-я гг. БДУ з'яўляўся адной з вядучых устаноў рэспублікі па падрыхтоўцы кадраў гісторыкаў вышэйшай кваліфікацыі. Існавалі два Саветы па абароне дысертацый па гістарычных дысцыплінах, якія ў 1995 г. аб'ядна-



ліся ў адзін. Усяго за 1992—2000 гг. у БДУ было абаронена 9 доктарскіх і 66 кандыдацкіх дысертацый, што складала адпаведна 24 і 45 % ад агульнай колькасці абарон за гэты перыяд. Найбольш актыўнымі сталі 1992—1993 гг. — па 3 дактары і па 9 кандыдатаў, у 1997 г., як увогуле ў рэспубліцы, не абаронена ніводнай доктарскай дысертацыі, у 1999—2000 гг. — таксама, пры піку кандыдацкіх у 1999 г. — 13. Выкладчыкамі гістарычнага факультэта БДУ паспяхова абаронены 3 доктарскія: В. А. Фядосік «Хрысціянская царква ў Рымскай імперыі ў III — пачатку IV ст.» (1992), М. С. Корзун «Руская Праваслаўная Царква: дзейнасць і светапогляд» (1993) і П. І. Брыгадзін «Эсэры на Беларусі (канец XIX ст. — люты 1917 г.)» (1995) — і 9 кандыдацкіх дысертацый. Адсутнасць доктарскіх дысертацый, абароненых выкладчыкамі БДУ у 1996—2000 гг., тлумачыцца тым, што абароненыя працы пачатку 90-х гг. фармуляваліся і рыхтаваліся яшчэ ў савецкі час, а ў 90-я гг. пачалася распрацоўка новых, раней недаследаваных праблем, якія патрабавалі значна больш часу для вывучэння і аналізу; навукоўцы актыўна ўдзельнічалі ў палітычных пераўтварэннях і грамадскім жыцці краіны, асабліва ў першай палове 90-х гг., адсунуўшы навуку на другі план; значна ўзрасла педагагічная нагрузка выкладчыкаў, што не давала фізічнай магчымасці актыўна займацца навуковымі даследаваннямі; адным з прыярытэтных накірункаў дзейнасці з'яўлялася распрацоўка падручнікаў. Усё гэта прывяло да скарачэння колькасці абароненых доктарскіх дысертацый. Пры гэтым аспірантура працавала больш стабільна і паспяхова, асабліва вочная, а з 1999 г. усталявалася тэндэнцыя: усе аспіранты заканчвалі тэрмін навучання з прадстаўленнем кандыдацкай дысертацыі да абароны. Тут з'яўляліся праблемы тэхнічнага кшталту, бо ў другой палове 90-х гг. Савет па абароне дысертацый па гістарычных дысцыплінах у БДУ працаваў з вялікімі перапынкамі, і разгляд падрыхтаваных прац адцягваўся.

На пачатку XXI ст. найбольш перспектыўнымі тэмамі далейшых навуковых гістарычных даследаванняў былі азначаны крыніцазнаўства, метадалогія гістарычнай навукі, гістарычная інфарматыка і псіхалогія, сацыяльная і культурная антрапалогія, стратыфікацыя беларускага грамадства і гісторыя грамадска-палітычных працэсаў і ідэалогій на Беларусі ў XIX—XX ст.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Архіў Беларускага дзяржаўнага універсітэта (БДУ). Ф. 205, воп. 8, спр. 4189, 4403, 4518, 4693, 4802, 4997, 5102, 5276, 5410, 5607.
2. Архіў БДУ. Ф. 205, воп. 8, спр. 4189, 4403, 5607.





3. Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў: матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 65-годдзю гіст. фак. БДУ, 26 лістап. 1999, Мінск / навук. рэд. Ю. Л. Казакоў і інш. Мн., 2000.
4. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная гісторыя Беларусі ў працах гісторыкаў БДУ / А. Г. Каханоўскі // Беларускі гістарычны часопіс (БГЧ). 2004. № 8.
5. Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 1. Мн., 2002.
6. *Яноўскі, А. А.* Кафедра гісторыі Расіі: заўсёды ў складзе БДУ і гістарычнага факультэта / А. А. Яноўскі // БГЧ. 2004. № 8.